# Працаўніца



Самыя лепшыя якасці жанчыны-працаўніцы падарыў лёс Марыі Мікалаеўне Нікалаенка. Дзесяткі гадоў цяжкай даярскай справы аддала вясковая працаўніца росквіту і дабрабыту калгасаў «Іскра» і «Чырвоны маяк». У апошнім працуе яна ўжо больш сямі гадоў.

Марыя Мікалаеўна з маленства прывучана да цяжкасцей. З гадамі да яе прыйшоў вопыт, навыкі. Яе нязменнымі спадарожнікамі сталі добрасумленнасць, стараннасць і працавітасць. Гэтыя лепшыя якасці, дадзеныя прыродай, ні на хвіліну не пакідаюць Марыю Мікалаеўну, вымяраюць яе працоўны шлях.

З задорам, працоўным агеньчыкам працуе даярка і зараз Нягледзячы на ўзрост, Марыя Мікалаеўна заўсёды вясёлая, га варкая, жыццерадасная. Вытворчыя дасягненні добрыя, яна заў сёды ў ліку лідэраў спаборніцтва сярод даярак фермы, калгас За шматгадовую працу навучыла М. М. Нікалаенка нялёгка даярскай справе шмат маладых дзяўчат. Разам са сваімі нав чэнцамі радуецца яна іх першым поспехам.

На здымку: М. М. Нікалаенка, даярка калгаса «Чырвоны мая

**Працаўніца** // Шлях Кастрычніка. — 1991. — 1 лістапада. — С. 2.
*Вытворчыя дасягненні Марыі Мікалаеўны Нікалаенка, даяркі калгаса “Чырвоны маяк”.*